***Гоўзіч І.М.***

***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



**ТЭМА 8. ІВАН НАВУМЕНКА.**

1. Падрыхтуйце **рэферат** пра жыццёвы шлях Івана Навуменкі, закраніце ў ім пытанне пра тое, як суадносяцца жыццё і творчасць пісьменніка?

2. **Складзіце** кароткую **анталогію** з лепшых, на вашу думку, выказванняў Івана Навуменкі-даследчыка літаратуры.

3. **Запішыце ў літаратурным сшытку параўнальную характарыстыку эпічнага і лірычнага твора** ў выглядзе табліцы. Якімі асаблівасцямі яны адрозніваюцца?

| Пытанні | Эпас | Лірыка |
|---|---|---|
| Мэта твораў | | |
| Прадмет твораў | | |
| Змест твораў | | |
| Функцыя мовы | | |
| Жанры твораў | | |
| Ключавыя паняцці пры аналізе мастацкага твора | | |

Паспрабуйце з дапамогай табліцы адказаць на пытанне: Якая стылявая плынь беларускай прозы выразна выявілася ў творчасці Івана Навуменкі?

4. **Прачытайце адно з пазапраграмных апавяданняў** І. Навуменкі і прааналізуйце яго ў адзінстве зместу і формы па наступным плане:

*1. Агульная характарыстыка гістарычных абставін, у якіх быў напісаны твор або пра якія напісаны твор.*

*2. Месца твора ў сістэме літаратурнай дзейнасці пісьменніка:*

*– да якога перыяду ён адносіцца;*

*–ці працаваў аўтар у час напісання твора над іншымі творамі.*

*3. Звесткі аб першай публікацыі твора, аб уплыве на свядомасць чытача, аб крытычных ацэнках твора (звяртаецца ўвага і на новае прачытанне).*

*4. Характарыстыка:*

*— часу, падзей, персанажаў, якія апісваюцца ў творы;*

*— асаблівасцей сюжэта, кампазіцыі, стылю твора;*

*— праблематыкі, канфлікту;*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*— мастацкіх сродкаў;*
*— ідэйнага зместу твора.*
*5. Аналіз філасофскай канцэпцыі аўтара.*
*6. Вашы асабістыя адносіны да мастацкага твора.*
*7. Прывядзіце прыклады ўрыўкаў твора, у якіх ёсць пацверджанні вашым разважанням аб асаблівасцях кампазіцыі, стылю, аб філасофскай канцэпцыі аўтара.*
*8. Месца твора ў гісторыі нацыянальнай і сусветнай літаратуры.*

5. **Напішыце ліст** да вашых сяброў-сучаснікаў (аднакласнікаў) ад імя галоўнага героя апавядання І. Навуменкі «Семнаццатай вясной» Цімоха.

6. Асаблівасці стылю Навуменкі-апавядальніка: афарыстычнасць, лірызм, павышаная экспрэсіўнасць, трапнасць мастацкай дэталі, тропаў, своеасаблівасць рытмікі. Дакажыце, што гэта менавіта так.

7. **Выпішыце з апавяданняў** І. Навуменкі ў літаратурны сшытак самыя яскравыя, на ваш погляд, **тропы** – сродкі мастацкай выразнасці, а таксама **наватворы** (неалагізмы), **дыялектызмы** і ўвогуле незразумелыя словы. Патлумачце іх значэнне і раскрыйце ролю.

8. Падрыхтуйце і правядзіце літаратурную **канферэнцыю** на тэму «Маладое пакаленне на вайне (паводле твораў І. Навуменкі, В. Быкава, І. Шамякіна).

9. **Дапамажыце кветцы аднавіць пялёсткі, у якіх пазначаюцца назвы твораў Івана Навуменкі:**




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ